


НАШЫХ СУГРАМАДЗЯН СТАЛА БОЛЬШ 2

ЯК ЗАХАВАЦЬ ПРЫГАЖОСЦЬ 13



Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

+TV ПРАГРАМА

13 МАЯ 2022 г. ПЯТНІЦА № 92 (29714)

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Аляксандр ВАЛЬФОВІЧ, дзяржаўны сакратар Савета бяспекі:**

*«Не так даўно ў Мінску прайшлі беларуска-расійскія міжведамасныя кансультацыі па інфармацыйнай бяспецы. Асаблівая ўвага была ўдзелена праекту Канцэпцыі інфармацыйнай бяспекі Саюзнай дзяржавы. Прынятыя дакументы накіраваны на выпрацоўку сумесных намаганняў па прыняцці міжнародных нормаў і правілаў адказных паводзін у інфармацыйнай сферы, процідзеянні кіберзлачыннасці. У праекце канцэпцыі знайшла адлюстраванне нацэленасць нашых краін на тэхналагічную незалежнасць шляхам пабудовы адзінай інфармацыйнай інфраструктуры, у тым ліку ў інтарэсах забеспячэння бяспекі Саюзнай дзяржавы ў галіне інфармацыйна-камунікацыйных тэхналогій, а таксама развіцця дзяржаўна-прыватнага партнёрства ў інфармацыйнай сферы».*

# Гарманіст з вёскі гарманістаў



Былы трактарыст-машыніст меліярацыі з вёскі Юзафоўкі Хоцімскага раёна Яўген ГАЯНКОЎ ніколі не расставаўся з любімым гармонікам. Іх у яго ажно два. Хоць і на пенсіі, нямала гадоў па сваім вяку ўжо мае, але яго душа па-ранейшаму маладая і прагне народных напеваў і застольна-бытавых песень, а найчасцей роднай, мясцовай музыкі. Калісьці вёска славілася сваімі музыкамі, сярод іх быў вельмі знакаміты і легендарны — сляпы ад нараджэння гарманіст Гапон. Менавіта ад гэтага дзеда-гарманіста і «захварэў» на музыку. А іграць Яўген Іванавіч пачаў яшчэ ў пятым класе.

— Калі працаваў на энерганасычаным трактары «Кіравец-700» — вазіў экскаватары, меліярацыйнае абсталяванне, — заўсёды браў з сабою і гармонік. Са свайго Хоцімска калясіў і ў Маладзечна, і ў Вілейку, і ў Магілёў, Оршу і Віцебск. У кабіне заўсёды было месца галоўнаму пасажыру — гармоніку. Інструмент даваў сілы пасля доўгай дарогі, падымаў настрой і мне, і слухачам, — прыгадвае музыка.

Яўген Гаянкоў працаваў па сумяшчальніцтве і кіраўніком вясковага клуба, арганізоўваў канцэрты, акампаніраваў іншым спевакам. А сам ён быў і застаецца прыпевачнікам. Дзясяткі, а можа, і сотні ведае ды спявае вясёлых прыпевак: пра каханне, пра вёску, пра маладосць, адным словам — пра жыццё. Цяпер жыхароў у Юзафоўцы не так шмат, як раней, і з гарманістаў застаўся толькі адзін Гаянкоў, аднак Яўген Іванавіч лічыць: пакуль іграе гармонік, будзе жыць і вёска!

**Анатоль КЛЯШЧУК, фота аўтара.**

## КОРАТКА

- **Лідары краін АДКБ сустрэнуцца 16 мая ў Маскве.**
- ДАІ ў Брэсцкай вобласці ўзмоцніць кантроль за матацыклістамі з 13 да 31 мая.
- **БРСМ 14 мая на Буйніцкім полі дасць старт трэцяму працоўнаму семестру.**
- Апаратамі ЭКМА аснасцяць усе абласныя бальніцы Беларусі. Экстракарпаральная мембранная аксігенацыя можа запатрабавацца, калі апарат штучнай вентыляцыі лёгкіх ужо не дапамагае.

Узровень

# БЫЦЬ НА СУВЯЗІ

### з улікам сучасных патрабаванняў

**Зрабіць паслугі тэлекамунікацыі яшчэ больш камфортнымі, прадаставіць роўныя магчымасці іх выкарыстання незалежна ад геаграфіі і гарантаваць нацыянальную бяспеку — вось асноўныя кірункі работы, якія вызначылі прадстаўнікі Міністэрства сувязі і інфарматызацыі Рэспублікі Беларусь, Дзяржаўнага прадпрыемства «БелДІЭ» і РУП «Белтэлеком». Перспектывы развіцця тэлекамунікацый у Беларусі і ўкараненне сучасных тэхналогій у такія працэсы абмеркавалі днямі.**

— Мы забяспечваем паўнацэннае і ўсебаковае развіццё сеткі тэлекамунікацый у Рэспубліцы Беларусь і заўсёды працуем па прынцыпе, што для паспяховай рэалізацыі неабходнае апераджальнае развіццё ўсёй інфраструктуры. І першае, што хочацца адзначыць, — тэлебачанне: наша краіна першая сярод краін СНД завяршыла пераход на лічбавае вяшчанне яшчэ ў 2015 годзе, забяспечыўшы патрабаванні міжнароднай стандартызацыі электрасувязі. Сёння ў нас больш за 99 працэнтаў тэрыторыі краіны ахоплена лічбавым тэлевізійным вяшчаннем. Наступны этап — мы ў актыўнай стадыі яго прапрацоўкі — каб праз антэну прадаставіць людзям ужо праграмы ў HD-фармаце, што дасць магчымасць камфортнага прагляду на тэлевізійным прыёмніку вялікай дыяганалі ў высокім распазнаванні, — расказаў **першы намеснік міністра Міністэрства сувязі і інфарматызацыі Рэспублікі Беларусь Павел ТКАЧ.**

СТАР. 3

Зварот у рэдакцыю

# РУБЕЛЬ З КАПЕЙКІ ПАХОДЗІЦЬ

### Чаму батон адзін і той жа — а цана розная?



**Нядаўна ў сталічным супермаркеце пазнаёмілася з жанчынай. Звярнула на яе ўвагу, бо Вольга набывала ажно 20 пачак цукру. Як аказалася, не сабе, а сваячцы, якая жыве ў вёсцы на Віцебшчыне. «Хутка ж пачнецца сезон нарыхтовак, а мая Галка фанат гэтай справы. Днямі званіла, распавядала, што цукар у іх вясковай краме каштуе ўжо тры рублі з капейкамі. Дык я ёй наказала, каб нават не думала страчваць грошы, я ёй тут, у Мінску, набуду амаль на рубель танней за кілаграм і з дзецьмі перадам. Калі адзін пачак купляеш, дык, можа, і не прынцыпова. А як 20 — дык розніца адчувальная. Парадокс нейкі — у людзей на вёсцы заробкі меншыя, а цэны там вышэйшыя», — пацікнула плячыма жанчына і накіравалася да касы.**

СТАР. 4

ISSN 1990 — 763X

22092

ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

Ідзе падпіска на «Звязду» на III квартал і II паўгоддзе

Мы абяцаем нясумнае лета з любімай газетай

ЗАСТАВАЙЦЕСЯ З НАМІ — БУДЗЕ ЦІКАВА!

З першых вуснаў

# «АДЛЕГЛАСЦІ СЁННЯ НІЧОГА НЕ ЗНАЧАЦЬ»

## Прэзідэнт Беларусі сустрэўся з губернатарам Хабараўскага краю

**Штомесячныя сустрэчы Аляксандра Лукашэнкі з прадстаўнікамі расійскіх рэгіёнаў працягваюцца. Гэтым разам — кантактамі з кіраўніком Хабараўскага краю Міхаілам Дзегцяровым. Мінск і Хабараўск раздзяляе больш за дзевяць тысяч кіламетраў, сем гадзін часу і розныя кліматычныя зоны. Знаходзіць шляхі для збліжэння да Аляксандра Лукашэнкі пасля 8-гадовага перапынку асабістых кантактаў з губернатарамі Хабараўскага краю прыехаў Міхаіл Дзегцяроў.**

«Адлегласці сёння нічога не значаць. Хабараўскі край ці Бранская, Смаленская вобласці... Адлегласці нічога не значаць, і сродкі сувязі ў нас нармальныя. Таму мы павінны гандляваць, а гандаль — аснова ўсякай эканомікі», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Паводле яго, кантакты нельга абмяжоўваць толькі гандлем, пастаўкамі тэхнікі, абсталявання, харчавання і прамысловай прадукцыі. «Гэта занадта проста. Неабходна пераходзіць да кааперацыі. І цяпер момант для таго, каб ствараць кааперацыйныя прадпрыемствы. Каб не толькі вы да нас прыязджалі і стваралі тут кааперацыі, але і мы гатовы працаваць у вас», — дадаў да тэмы Прэзідэнт.

Ён адзначыў, што беларуская эканоміка «празмерная» для нашай краіны — экспарт такі ж, як мы спажываем, таму імкнёмся развіваць пэўныя сферы ў іншых краінах, асабліва ў рэгіёнах Расійскай Федэрацыі. Кааперавацца Аляксандр Лукашэнка прапануе ў вытворчасці грузавых аўто, дарожна-будаўнічай, лесанарыхтоўчай, камунальнай тэхнікі, пасажырскага транспарту.

«Гэта тое, што мы захавалі з Савецкага Саюза, і нам удалося сур'ёзна ў гэтых кірунках прасунуцца. Калі вас нашы тэхналогіі задавальняюць, мы гатовы ў гэтым кірунку працаваць. Перашкод для гэтага няма. Мы з Прэзідэнтам Расіі дамовіліся, што сёння момант для выбудоўвання цесных кааперацыйных сувязяў», — падкрэсліў Прэзідэнт.

Расказаў ён і пра напрацоўкі ў ваенна-прамысловым комплексе. Адзначыў Прэзідэнт, што беларусы значна прасунуліся ў плане аўтаматызаваных сістэм кіравання, оптыкі і электронікі.

«У вас магутны абаронны комплекс. Тым не менш прадукцыю двайнога прызначэння ствараем мы. Калі ў вас будзе інтарэс, паглядзіце. Мы гатовы працаваць у гэтым кірунку з вамі», — акцэнтаваў Аляксандр Лукашэнка.

Кіраўнік краіны заявіў, што ўспрымаць Беларусь выключна як пастаўшчыка прадукцыі АПК недарэчна. «Не гэта галоўнае, але нешта мы навучыліся ў сельскай гаспадарцы рабіць і не саступаем па сучасных тэхналогіях у агракомплексе ніводнай вядучай краіне свету. І сённяшняя сітуацыя паказала і пацвердзіла, што мы канкурэнтаздольныя», — дадаў Аляксандр Лукашэнка і прапанаваў сур'ёзную сумесную працу ў АПК. Тым больш такі вопыт з Далёкім Усходам Расіі ўжо ёсць. У Амурскай вобласці, на Сахаліне беларусы будавалі малочнатаварныя комплексы, забяспечвалі іх жывёлай. Прэзідэнт заўважыў: усё залежыць ад спецыялістаў, а іх беларусы гатовы падрыхтаваць.

«Ад паставак прадуктаў харчавання да падрыхтоўкі кадраў і стварэння на Далёкім Усходзе, у Хабараўскім краі, маякоў у малочнатаварным комплексе, птушкагадоўлі мы можам падзяліцца вопытам. Мы гатовы ў гэтым плане дзейнічаць», — дадаў Прэзідэнт.

Прапанаваў Аляксандр Лукашэнка хабараўчанам беларускае абсталяванне для захавання прадукцыі, будаўнічы патэнцыял «пад ключ» у сацыяльнай сферы, жыллёвым і маставым будаўніцтве.

«У нас дастаткова спецыялістаў у гэтым плане. Ад пачатку да канца мы гатовы вельмі якасна працаваць. І па цэнах мы з любым замежным прадпрыемствам гатовы канкурыраваць, і па якасці», — сказаў кіраўнік краіны.

Беларускія спецыялісты таксама гатовы пастаўляць абсталяванне па водаачысцы, водаадвядзенні, каналізацыі і ўвесь комплекс аўтатэхнікі, дадаў ён.

«Я гэта вам гавару для таго, каб у Расіі ніхто не перажываў наконт санкцый. Мы самі зможам справіцца з любымі праблемамі, каб забяспечыць нармальнае жыццё людзей на прасторах нашай Айчыны. Проста неабходна крыху часу, каб пашырыць вытворчасць і развіваць кааперацыю, пра якую я казаў», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка.

Прэзідэнт расказаў госцю пра сваю «ідэалогію» з сярэдзіны 1990-х пасля распаду Савецкага Саюза.

«Нягледзячы на вялікую адлегласць паміж Беларуссю і Хабараўскім краем, я лічу, што наша агульная Айчына — ад Брэста да Уладзівастока. І, нягледзячы на тое, што на гэтай агульнай прасторы з'явіліся незалежныя і суверэнныя дзяржавы, мы, як разумныя людзі, павінны адысці ад рознага чыну забабонаў і арганізаваць нармальнае ўзаемадзеянне, каб было не горш, чым у Савецкім Саюзе. Пры гэтым не напружваючы нікога ў Расіі, Беларусі, Украіне, Казахстане і іншых краінах, зрабіць так, каб наш вопыт быў запатрабаваны і прыцягальны для іншых рэспублік», — падзяліўся кіраўнік краіны.

Прэзідэнт дадаў, што яго «ідэалогія» засноўваецца на думцы, што ўсходнеславянская цывілізацыя — адна з апор сусветнай. «Знішчожыць яе — гэта значыць знішчожыць як мінімум палову планеты. Мы павінны на гэтым стаяць і вытрымаць. Гэта асабліва актуальна», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

**Марыя ДАДАЛКА.**

### Каментарый у тэму

**Міхаіл ДЗЕГЦЯРОЎ, губернатар Хабараўскага краю,** расказаў, што ў Мінску ён упершыню, але адчувае сябе як дома. Верагодна, таму, што, па яго словах, беларусы ўдзяляюць вялікую ўвагу сумеснай гістарычнай памяці народаў аб Вялікай Айчыннай вайне.

«Гэта асабліва актуальна, калі Рэспубліка Беларусь і Расія адчуваюць на сабе беспрэцэдэнтны санкцыйны ціск з боку Захаду, вераломна ўводзяцца санкцыі, праводзіцца практычна экспрапрыяцыя ўласнасці нашых краін за мяжой. Гэта выбар Захаду, а не наш. Таму мы ў сітуацыі, што склалася, хочам і гатовы выбудоўваць яшчэ больш цеснае супрацоўніцтва з прадпрыемствамі Рэспублікі Беларусь», — сказаў губернатар.

Журналістам Міхаіл Дзегцяроў падкрэсліў, што прыехала ў Мінск не толькі дэлегацыя ўрада Хабараўска. Прывезлі яны з сабой і бізнес-місію, у складзе якой прадпрымальнікі, зацікаўленыя ў набыцці беларускіх тавараў машынабудавання, сельскай гаспадаркі.

«Мы ўсе гэтыя дні будзем працаваць над выбудоўваннем новых лагістычных ланцужкоў. Трэба сказаць, што з-за заходніх санкцый сур'ёзна правялі імпартазамяшчэнне «мазгоў» нашых прадпрымальнікаў, што перабудоўваюць свае лагістычныя і таварныя ланцужкі на Усход і ў Беларусь. Мы будзем купляць тут новыя БелАЗы, МАЗы, аўтобусы, вытворчыя лініі для малочнай жывёлагадоўлі. Абавязкова пабудуем у сябе ферму. Прыедзе дэлегацыя на выстаўку «Белагра» і паглядзіць на магчымасці, што можа прадставіць Рэспубліка Беларусь для нашых сялян», — паведаміў суразмоўнік.

Асабліва цікавіць хабараўчан вопыт беларускіх будаўнікоў, бо ў рэгіёне адчуваецца дэфіцыт рабочай сілы на будоўлях.

«Вынік, я ўпэўнены, не прымусіць сябе чакаць. Мы дапаможам рублём Рэспубліцы Беларусь, а Рэспубліка Беларусь і мясцовыя прадпрымальнікі дапамогуць нам у развіцці нашага рэгіёна», — запэўніў Міхаіл Дзегцяроў.

# «КААПЕРАЦЫЯ І ІМПАРТАЗАМЯШЧЭННЕ — ТЫЯ ШЛЯХІ, ПА ЯКІХ МЫ ПАВІННЫ РУХАЦЦА»

**Кааперацыя і імпартазамяшчэнне — тыя шляхі, па якіх павінна прасоўвацца супрацоўніцтва Беларусі і Расіі. Такое меркаванне Прэзідэнт Беларусі выказаў на сустрэчы з паслом Расіі Барысам Грызловым пасля перагавораў з дэлегацыяй Хабараўскага краю.**

«Кааперацыя і імпартазамяшчэнне — тыя шляхі, па якіх мы павінны рухацца. Усе астатнія пытанні вам зразумелыя. Вы ведаеце нашу пазіцыю, пачынаючы ад спецыяльнай ваеннай аперацыі і заканчваючы стратэгіяй развіцця ў космасе. Мы свята выконваем гэта. Вы можаце не перажываць і заўсёды спадзявацца на Беларусь», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Па яго словах, увесь час у беларуска-расійскім супрацоўніцтве былі актуальныя тэмы нафты, газу, гандлю. Аляксандр Лукашэнка дадаў, што гэтыя пытанні вырашаюцца, але не яны галоўныя зараз у адносінах.

«Я абдумваю гэтыя праблемы. Пры сустрэчы з Прэзідэнтам Расіі мы будзем іх сур'ёзна яшчэ раз абмяркоўваць. Імпартазамяшчэнне — гэтае пытанне вельмі важнае. Шмат кампетэнцый і ў Беларусі, і ў Расіі. Але яны з-за пэўных прычын не развіваліся так, як неабходна. Але, дзякуй богу, гэтыя кампетэнцыі існуюць», — заявіў Прэзідэнт.

Асаблівае пытанне, паводле слоў кіраўніка краіны, — дзейнасць «Інтэграла» — яго прадукцыя і супрацоўніцтва з падобнымі прадпрыемствамі ў Расіі. «Мы маем сур'ёзныя зачыны. Дапусцім, «Гарызонт» для авіябудаўніцтва стварае шмат прадукцыі, пра якую нават расіяне не ведалі, як мне нядаўна далажылі. Гэта прадукцыя звязана з кіраваннем касмічнымі апаратамі, самалётамі. Шмат прадукцыі мы робім для беспілотнікаў», — расказаў Аляксандр Лукашэнка.

Прэзідэнт дадаў, што не збіраюцца ў Беларусі згортваць і IT-сферу. «Некаторыя кажуць, што Лукашэнка зараз усіх айцішнікаў павыганяе. Не! Недарэмна я гэты парк (ПВТ. — «**Зв.**») стварыў. Ён працуе і будзе працаваць. Я$проста зараз цесна займаюся гэтым пытаннем, бо мне неабходна сустрэцца з айцішнікамі і не толькі ў IT-парку. IT-парк даў штуршок развіццю айцішнай сферы на ўсіх прадпрыемствах і ў Акадэміі навук. Неабходна паразмаўляць з імі, якая неабходна ім дапамога», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

Ён выказаў думку, што разам з Расіяй неабходна схіліць айцішнікаў да стварэння гатовага канчатковага прадукту, «а не быць на пабягушках» у буйных кампаній.

«Так, грошы, мільярды долараў. Гэта зразумела. Але неабходна рабіць з нуля гатовы прадукт і асвойваць яго на постсавецкай прасторы. Перадусім у Беларусі, і Расіі. Ёсць дзе разгарнуцца. Так, канешне, будуць патрэбныя сродкі, але гэта не гіганцкія грошы. Мы разам іх можам знайсці. Можам у саюзным бюджэце прадугледзець пэўную тэматыку і развіваць», — мяркуе Прэзідэнт.

**Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Расіі ў Беларусі Барыс ГРЫЗЛОЎ** у сваю чаргу заявіў на сустрэчы, што Дзень Перамогі, які святкавалі нядаўна, — асаблівая гістарычная падзея для лёсу ўсяго свету.

«У вас было вельмі гучнае выступленне 9 Мая. Мы ўсе яго чулі. Расстаўлены акцэнты. У тым ліку ў адносінах да так званага калектыўнага Захаду. Безумоўна, у нас адзіная пазіцыя ў дачыненні да ўсіх гэтых пытанняў», — сказаў пасол.

Наконт эканамічных кантактаў ён падкрэсліў, што за чатыры месяцы яго дыпламатычнай работы ў Беларусь завітала ўжо шэсць дэлегацый рэгіёнаў Расіі.

«Абмяркоўваецца менавіта пытанні імпартазамяшчэння, павелічэння тавараабароту паміж Рэспублікай Беларусь і нашымі рэгіёнамі. Напярэдадні Форуму рэгіёнаў, які пройдзе ў Гродне 23—24 чэрвеня, можна сказаць, што мы напоўнім парадак дня падпісаннем кантрактаў, аб'ём якіх будзе вялікі. Я думаю, што нашы рэгіёны да гэтага гатовы», — падкрэсліў Барыс Грызлоў.

**Марыя ДАДАЛКА.**

# НАШЫХ СУГРАМАДЗЯН СТАЛА БОЛЬШ

## Згодна з указам Прэзідэнта, беларускае грамадзянства атрымалі 319 чалавек

**290 з іх — грамадзяне Украіны. У асноўным гэта асобы, якія прыбылі ў нашу краіну з Данецкай і Луганскай абласцей. Раней, згодна з рашэннем кіраўніка дзяржавы, толькі са жніўня 2021 года беларускае грамадзянства атрымалі 1784 украінцы, у тым ліку 390 дзяцей.**

— Усе хадайніцтвы органамі ўнутраных спраў разглядаліся ў межах даручэння кіраўніка дзяржавы аб спрашчэнні працэдуры натуралізацыі для грамадзян Украіны, якія пражываюць і працуюць на тэрыторыі нашай краіны, — адзначыў **намеснік начальніка Дэпартамента па грамадзянстве і міграцыі Міністэрства ўнутраных спраў Павел ХРЫШЧАНОВІЧ.** — Мы аператыўна афармляем адпаведныя дакументы і ўносім іх для разгляду ў Адміністрацыю Прэзідэнта. Нягледзячы на пэўныя палітычныя падзеі, усе грамадзяне Украіны, якія падалі хадайніцтвы аб набыцці грамадзянства Рэспублікі Беларусь, сваё жаданне не памянялі.

Пры гэтым, па словах прадстаўніка міліцэйскага ведамства, колькасць грамадзян Украіны, якія маюць намер атрымаць беларускае грамадзянства, дастаткова вялікая. Работа па выкананні даручэння Прэзідэнта аб аператыўным разглядзе матэрыялаў дадзенай катэгорыі асоб працягваецца.

Акрамя таго, Павел Хрышчановіч адзначыў, што значная колькасць грамадзян Украіны, якая хадайнічае, мае права на спрошчаны парадак набыцця беларускага грамадзянства: у такім выпадку рашэнне прымаецца на ўзроўні абласных упраўленняў унутраных спраў. «Згодна з даручэннем кіраўніка дзяржавы, такім правам скарысталася 1750 грамадзян Украіны, — заўважыў намеснік начальніка Дэпартамента па грамадзянстве і міграцыі МУС. — Усяго ў рамках рэалізацыі даручэння Прэзідэнта грамадзянства Рэспублікі Беларусь набыло 4300 чалавек, з якіх звыш 3,5 тысячы грамадзян Украіны і больш як 700 грамадзян іншых дзяржаў.

**Вераніка КАНЮТА.**

Блізкая ўлада

# ВЫКАНКАМЫ НА СУВЯЗІ

**Практыка правядзення прамых ліній рэгіянальнай вертыкаллю працягваецца. Калі ў вас ёсць пытанні або праблемы, якія патрабуюць умяшання органаў улады, тэлефануйце.**

Тэлефонныя лініі ў суботу, 14 мая, з 9.00 да 12.00 правядуць:

- кіраўнік спраў Брэсцкага аблвыканкама Сяргей Мікалаевіч ЛАБАДЗІНСКІ. Тэл. 8 016 221 31 21;
- намеснік старшыні Віцебскага аблвыканкама Барыс Сяргеевіч ЯФРЭМАЎ. Тэл. 8 021 222 22 22;
- намеснік старшыні Гомельскага аблвыканкама Уладзімір Аляксандравіч ПРЫВАЛАЎ. Тэл. 8 023 233 12 37;
- старшыня Гродзенскага аблвыканкама Уладзімір Сцяпанавіч КАРАНІК. Тэл. 8 015 273 56 44;
- намеснік старшыні Магілёўскага аблвыканкама Валерый Анатолевіч МАЛАШКА. Тэл. 8 022 250 18 69;
- старшыня Мінскага абласнога Савета дэпутатаў Наталля Віктараўна ЯКУБІЦКАЯ. Тэл. 8 017 500 41 60;
- старшыня Мінскага гарвыканкама Уладзімір Яўгенавіч КУХАРАЎ. Тэл. 8 017 222 44 44.

Парламенцкі дзённік

# ЗАКАНАДАЎСТВА, АДАПТАВАНАЕ ДА НОВЫХ ВЫКЛІКАЎ І ПАГРОЗ

## Падчас чарговага пасяджэння восьмай сесіі сёмага склікання дэпутаты разгледзелі дзевяць законапраектаў

**Адзін з іх — «Аб змяненні Крымінальна-працэсуальнага кодэкса Рэспублікі Беларусь» (па пытаннях апеляцыйнай і наглядной вытворчасці) — датычыцца ўдасканалення судовай сістэмы. Палажэнні праекта адпавядаюць прынцыпам законнасці, абгрунтаванасці і справядлівасці судовых пастанаўленняў па крымінальных справах, накіраваны на забеспячэнне празрыстасці судовых працэдур, фарміраванне аднастайнай судовай практыкі, павышэнне апеляцыйнасці і эканамічнасці судовай дзейнасці.**

Як расказаў **Старшыня Вярхоўнага Суда Валянцін СУКАЛА,** які прадстаўляў законапраект, дакумент падрыхтаваны Вярхоўным Судом сумесна з зацікаўленымі дзяржаўнымі органамі па даручэнні кіраўніка дзяржавы і накіраваны на павышэнне якасці крымінальнага правасуддзя на ўсіх яго стадыях. Па яго словах, дагэтуль якасці крымінальнага правасуддзя на заключных стадыях крымінальнай судавытворчасці не ўдзялялася дастатковай увагі.

У першым чытанні быў разгледжаны праект Закона «Аб змяненні Крымінальна-працэсуальнага кодэкса Рэспублікі Беларусь» (па пытаннях спецыяльнай вытворчасці). Як адзначыў **старшыня Следчага камітэта Дзмітрый ГАРА,** дакумент дазволіць прыцягнуць да крымінальнай адказнасці асоб, якія хаваюцца за межамі Рэспублікі Беларусь і здзейснілі злачынствы супраць міру і бяспекі чалавецтва, ваенныя злачынствы, іншыя цяжкія злачынствы тэрарыстычнай і экстрэмісцкай накіраванасці.

«Акрамя таго, прыняцце гэтага закона дазволіць нам зрабіць канкрэтныя рашэнні ў дачыненні да абвінавачаных асоб аб канфіскацыі іх маёмасці, абмежаванні правоў, — заўважыў старшыня Следчага камітэта. — Мы зможам больш эфектыўна аднаўляць парушаныя правы грамадзян, адстойваць інтарэсы дзяржавы».

Дзмітрый Гара заўважыў, што спецыяльная вытворчасць не будзе мець масавага характару, і расказаў, што Польшча адмовіла Беларусі ў выдачы Сцяпана Пуцілы, а Літва — Святланы Ціханоўскай. «Яшчэ ў лістападзе 2020 года ў Рэспубліку Польшча быў накіраваны запыт аб выдачы Пуцілы для ажыццяўлення крымінальнага пераследу за распальванне расавай, нацыянальнай, рэлігійнай варожасці і розні, арганізацыю масавых беспарадкаў і іншыя злачынствы, — удакладніў ён. — Афіцыйная адмова на нашу просьбу прыйшла толькі ў лютым 2022 года. З фармулёўкай — «аказанне прававой дапамогі можа нанесці шкоду суверэнітэту і бяспецы, правам і законным інтарэсам грамадзян або супярэчыць асноўным прынцыпам дзеючага заканадаўства». Літоўскай Рэспублікай адмоўлена ў выдачы Ціханоўскай, якая таксама абвінавачваецца ў здзяйсненні шэрагу цяжкіх злачынстваў, у тым ліку змовы з мэтай захопу дзяржаўнай улады».

— Сёння вельмі важна адаптаваць заканадаўства ў сувязі з новымі выклікамі і пагрозамі для нашай нацыянальнай бяспекі, — акцэнтавала ўвагу **член Пастаяннай камісіі па нацыянальнай бяспецы Марына ЛЯНЧЭЎСКАЯ.** — І мы павінны дзейнічаць вельмі дакладна, канкрэтна і адэкватна абставінам, якія складваюцца. Сёння ёсць абвінавачаныя ў злачынствах супраць нацыянальнай бяспекі, супраць міру, бяспекі чалавецтва, ваенных злачынствах. Гэтыя злачынцы хаваюцца ў замежных дзяржавах, якія ў парушэнне ўсяляких міжнародных норм або адмаўляюць у экстрадыцыі абвінавачаных у Рэспубліку Беларусь, або ў прынцыпе ігнаруюць нашы запыты. Таму і прапаноўваецца ў Крымінальна-працэсуальны кодэкс увесці так званую спецыяльную вытворчасць: гэта, па сутнасці, правядзенне ўсіх працэсуальных дзеянняў у адсутнасць абвінавачанага.

Пры гэтым, заўважыла дэпутат, інфармацыя аб тым, што спецыяльная вытворчасць вядзецца ў адносінах таго ці іншага абвінавачанага ў спецыяльным парадку, будзе размяшчацца на інтэрнэт-парталах адпаведнага органа крымінальнага пераследу, абвінавачанаму будзе давацца абаронца. Калі асоба, абвінавачаная ў злачынстве супраць нацыянальнай бяспекі, вернецца на тэрыторыю Беларусі, то такая крымінальная справа нават са стадыі судовага следства можа быць накіравана ў орган папярэдняга расследавання.

У першым чытанні дэпутаты адобрылі законапраект «Аб урэгуляванні бяспекі пры выкарыстанні атамнай энергіі». Як паведаміў **міністр па надзвычайных сітуацыях Вадзім СІНЯЎСКІ,** з уводам у эксплуатацыю першага энергаблока БелАЭС Беларусь стала краінай, якая эксплуатуе атамную станцыю. «З улікам правапрымяняльнай практыкі, новых міжнародных патрабаванняў узнікла неабходнасць удасканальваць нацыянальнае заканадаўства ў сферы ядзернай і радыяцыйнай бяспекі», — заўважыў ён.

Дакумент накіраваны на ўмацаванне і падтрыманне належнага ўзроўню ядзернай і радыяцыйнай бяспекі пры выкарыстанні атамнай энергіі. Прыярытэт бяспекі пры выкарыстанні ядзернай энергіі, замацаваны на заканадаўчым узроўні, будзе садзейнічаць забеспячэнню абароны жыцця, здароўя, правоў і законных інтарэсаў грамадзян, а таксама ахове навакольнага асяроддзя, умацаванню іміджу Рэспублікі Беларусь на міжнароднай арэне як краіны, якая падзяляе сучасныя міжнародныя патрабаванні да бяспекі.

Акрамя таго, у першым чытанні прынялі праект Закона «Аб змяненні Закона Рэспублікі Беларусь «Аб дзяржаўна-прыватным партнёрстве». На меркаванні **члена Пастаяннай камісіі па эканамічнай палітыцы Анатоля НАСЕНІ,** законапраект мае вялікае значэнне менавіта для перспектывы адносін дзяржавы і бізнесу ў галіне рэалізацыі грамадска значных праектаў і ў цэлым для рашэння сацыяльна-эканамічных задач. Па яго словах, прыняцце дадзенага законапраекта знойдзе пазітыўныя водгукі ў бізнес-асяроддзі і дазволіць дадаткова прыцягнуць інвестыцыі ў эканоміку нашай краіны.

— Адным з наватоўведзенняў законапраекта з'яўляецца тое, што прадугледжаны прамыя перагаворы па праектах, якія не прадугледжваюць бюджэтнага фінансавання, — расказаў парламентарый. — Другі важны момант — аптымізацыя функцый і паўнамоцтваў дзяржаўных органаў. У цэлым дакумент накіраваны на спрашчэнне працэдуры і тэрмінаў пагаднення ў дзяржаўна-прыватным партнёрстве.

Абсалютнай большасцю парламентарыі прагаласавалі за праект Кодэкса Рэспублікі Беларусь аб архітэктурнай, горадабудаўнічай і будаўнічай дзейнасці, разгледжаны ў першым чытанні. Дакумент накіраваны на абагульненне і актуалізацыю нарматыўных прававых актаў у галіне архітэктурнай, горадабудаўнічай і будаўнічай дзейнасці і забеспячэнне больш эфектыўнага прававога рэгулявання адносін у гэтай сферы.

Як заўважыў **старшыня Пастаяннай камісіі па жыллёвай палітыцы і будаўніцтве Віктар НІКАЛАЙКІН,** дакумент стане настольнай кнігай, дарожнай картай для будаўнікоў. «Шэраг артыкулаў Кодэкса прысвечаны спрашчэнню працэсу будаўніцтва: будаўнікі павінны будаваць, а не бегаць па кабінетах чыноўнікаў, — падкрэсліў дэпутат. — У прыватнасці, мы прапаноўваем пералік аб'ектаў, пры будаўніцтве якіх не будзе патрабавацца афармленне дазвольнай дакументацыі. У асноўным гэта датычыцца індывідуальных жылых дамоў, дачных і садовых домікаў, гаражоў. Акрамя таго, вызначаецца шэраг будаўнічых аб'ектаў, у дачыненні да якіх будзе неабавязковае правядзенне дзяржаўнага будаўнічага нагляду. Таксама прадугледжваецца пашырэнне паўнамоцтваў мясцовых органаў улады: пачынаючы ад пытанняў будаўніцтва, заканчваючы зацвярджэннем генеральных планаў гарадоў раённага падначалення».

У першым чытанні быў адобраны і законапраект «Аб змяненні законаў па пытаннях дзяржаўнага сацыяльнага страхавання», у другім — праект Закона «Аб дзяржаўнай службе». Таксама дэпутаты ратыфікавалі Пратакол аб унясенні дапаўнення ў Пагадненне паміж урадамі Беларусі і Арменіі аб узаемных бязвізавых паездках грамадзян дзвюх краін, а таксама Пагадненне паміж урадамі Беларусі і Арменіі аб рэадмісіі.

**Вераніка КАНЮТА.**

# БЫЦЬ НА СУВЯЗІ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*



— Цяпер мы маем універсальную мультысэрвісную платформу, якая з выкарыстаннем аднаго валаконна-аптычнага кабелю аказвае ўвесь комплекс паслуг. Гэта дало і высокую якасць, і скарачэнне ў тым ліку энергаспажывання. І цяпер ужо больш за 90 % насельніцтва падключана да згаданай платформы. Да 2025 года работы ў такім напрамку будуць поўнасцю завершаны.

Як адзначыў прадстаўнік ведамства, для здзяйснення пералічаных задум было пабудавана шмат аб'ектаў і ліній электрасувязі. Колькасць ліній на сёння складае больш за 150 тысяч кіламетраў (што дазволіла б чатыры разы абагнуць Зямлю вакол экватара). У лідарах, што датычыцца Еўрапейскага рэгіёна, Беларусь і па колькасці тых, хто сёння ўжо падключаны да валаконна-аптычных ліній сувязі (64 % дамоў). На перспектыву тут ставяць задачу завяршыць распачатае і разам з тым забяспечыць максімальную перадачу даных і больш высакаскорасныя спалучэнні — 100 МГб і вышэй. У апошнія два гады з'явілася паслуга «відэакантроль», што дазваляе як гарантаваць грамадскую бяспеку, так і ажыццяўляць, напрыклад, нагляд за ўласным аўто альбо за дзецьмі, якія гуляюць у двары. Можна нават скарыстацца паслугай відэааналітыкі і пераканацца, ці своечасова прыбралі пад'езд, як робіцца рамонт і г. д. Такім чынам, сёння ўжо актуальна прапрацоўваецца пытанне, каб уключыць паслугу відэаназірання ў склад камунальных паслуг.

Што датычыцца развіцця сотавай сувязі ў Беларусі, то сёння завяршаецца будаўніцтва сеткі 4G. І да 2023 года павінна быць забяспечана пакрыццё ўсёй тэрыторыі краіны. Безумоўна, усіх цікавіць пытанне, а што з 5G? Гэта перспектыўная тэхналогія і самая чаканая, як у самім міністэрстве, так і сярод карыстальнікаў. На дадзены момант створана рабочая група і распрацаваны тры варыянты стратэгіі, кожная з якіх мае свае недахопы і перавагі як у фінансавай, так і арганізацыйнай і тэхнічнай мадэлі, як для аператараў, так і для дзяржавы. Варыянты вынесены на разгляд рабочай групы. Чакаецца, што ў хуткім часе з'явіцца канчатковае рашэнне адносна таго, па якой стратэгіі будзе рэалізоўвацца работа ў дадзеным напрамку ў Беларусі. Перавагі сеткі відавочныя: гэта высокая хуткасць перадачы даных, якая будзе ў дзясяткі разоў перавышаць існуючую 4G, нізкая затрымка сігналу і магчымасць будаўніцтва некалькіх слаёў такіх сетак, дзе кожная зможа існаваць незалежна і не перашкаджаючы іншым.

Павел Ткач таксама адзначыў, што расце колькасць карыстальнікаў «Белтэлекама», як і колькасць тых, хто карыстаецца мабільным інтэрнэтам. Сумеснае развіццё як праваднога, так і бесправаднога інтэрнэту робіць папулярнымі так званыя канвергентныя паслугі, калі ў рамках аднаго пакета абанент можа мець і той, і іншы від паслуг. Гэта дазволіць вырашыць пытанне лічбавай няроўнасці, паколькі правядзенне валакна ў аддаленыя населеныя пункты не заўсёды эканамічна мэтазгоднае. А выкарыстанне радыёэфір дапамагае забяспечыць сучаснымі лічбавымі тэхналогіямі насельніцтва ў такіх месцах.

У сваю чаргу **першы намеснік генеральнага дырэктара РУП «Белтэлекам» Генадзь МЕЛЬНІКАЎ** расказаў аб актыўным нарошчванні сеткі і валаконна-аптычных ліній сувязі (на сёння пабудавана 7,9 тысячы кіламетраў такіх ліній). Дзякуючы таму, што сёння ў краіне пабудавана сучасная разгалінаваная сетка ліній сувязі, ствараецца інфраструктура для развіцця лічбавай эканомікі і трансфармацыі ўсіх сучасных паслуг на тэрыторыі нашай краіны.

— Адна з самых галоўных задач, якія мы вырашаем, — гэта адсочванне і сціранне лічбавай няроўнасці паміж горадам і вёскай. Паколькі сетка «Белтэлекам» прысутнічае на тэрыторыі ўсёй Беларусі, мы паспяхова рэалізоўваем і гэты праект, — расказвае Генадзь Васілевіч. — Асноўная задача «Белтэлекама» на сённяшні дзень — гэта далейшае развіццё тэхналогій на базе сучасных аптычных сетак. Па пранікненні такіх сетак мы на другім месцы ў Еўропе. Цяпер актыўна развіваем платформы «Мой горад», «Мой універсітэт», супрацоўнічаем з установамі аховы здароўя і адукацыі. Валаконна-аптычнымі лініямі сувязі забяспечаны ўсе нашы аб'екты аховы здароўя і адукацыі, на базе якіх маецца магчымасць прымяняць свае высокатэхналагічныя паслугі і платформы. Яшчэ кіраўніком дзяржавы нядаўна быў падпісаны ўказ, дзе «Белтэлекам» надзелены правам аператара рэспубліканскай сістэмы маніторынгу грамадскай бяспекі. І тая валаконна-аптычная сетка, якая сёння ў нас пабудавана, дазволіць нам паспяхова ў адведзеныя тэрміны рэалізаваць гэты важны праект для бяспекі нашай краіны. У Беларусі было распачата стварэнне рэспубліканскай сістэмы маніторынгу грамадскай бяспекі. І сёння гэтае пытанне набыло першараднае значэнне, таму нам даручылі працягваць ствараць такую сістэму. Мы сумесна з Міністэрствам сувязі і інфарматызацыі знаходзімся ў актыўнай фазе рэалізацыі пастаўленай задачы.

Так, камеры з'яўляцца ў спецыяльна вызначаных месцах (дарогі, будынкі, запраўкі, плошчы і г. д.), што дасць магчымасць адсочваць і аператыўна рэагаваць на надзвычайныя сітуацыі, ажыццяўляць маніторынг, напрыклад, пажарнай бяспекі, спрыяць раскрыццю злачынстваў і іншае. І «Белтэлекам» стварае патрэбную для гэтага інфраструктуру. У планах да канца 2023 года завяршыць праект.

Прысутныя таксама падкрэслілі, што на сёлетняй выстаўцы «ТІБО-2022» прадэманструюць свае напрацоўкі ў кантэксце таго, каб і далей захоўвалася інавацыйнасць і пашыраліся паслугі тэлекамунікацый на тэрыторыі краіны. Напрыклад, **дырэктар Дзяржаўнага прадпрыемства «БелДІЭ» Аляксей ІВАШКІН** анансаваў, што будзе прадстаўлена пробная версія мабільнага дадатку «Хваля», з дапамогай якога кожны абанент зможа стаць асобнай вымяральнай адзінкай. Ён здолее аператыўна сігналізаваць аб праблемных месцах і паказчыках у сетках сотавай перасоўнай мабільнай сувязі, што заклікана падштурхнуць аператараў да развіцця сваіх сетак і павышэння якасці абслугоўвання абанентаў.

**Алена ДРАПКО.**

# РУБЕЛЬ З КАПЕЙКІ ПАХОДЗІЦЬ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*



З падобным пытаннем у рэдакцыю звярнуўся і Віктар Шасцюк з вёскі Раз'езд Фалічы Старадарожскага раёна Мінскай вобласці. Ён піша, што спачатку купіў батон «Нежный» у горадзе Старыя Дарогі, а потым, праз некалькі дзён, — дакладна такі ж у сябе па месцы жыхарства, у аўталаўцы Любанскага райпа. «Батон вырабляецца ўсё тым жа Любанскім райпа. Адпаведна, не павінна быць накрутак, бо пакупнік набывае яго напрамую ў вытворцы, без пасрэднікаў. Але чамусьці ў аўталаўцы батон «Нежный» каштуе на 6 % даражэй, чым у гарадской краме?! Лічу, што гэта неабгрунтаванае ўстанаўленне няроўнасці жыхароў вёскі і горада».

Чаму адзін і той жа батон у розных крамах можа каштаваць па-рознаму? Пракаментаваць зварот чытача мы папрасілі ў Міністэрстве антыманапольнага рэгулявання і гандлю Рэспублікі Беларусь (далей — МАРГ).

Жыхар вёскі Раз'езд Фалічы 28 сакавіка быў у райцэнтры. Зайшоў там у краму «Юлія» (належыць гандлёваму ўнітарнаму прадпрыемству «Гандлёвая кампанія «Камплімілк Трэйд») і набыў батон «Нежный». Заплаціў за яго 1,19 руб. 7 красавіка такі ж батон у аўталаўцы абышоўся яму ў 1,25 руб.

Адпускная цана вытворцы на батон «Нежный» як на 28 сакавіка, так і на 7 красавіка складала 0,95 руб. Чаму ж тады ён у гарадской краме каштаваў на шэсць капеек танней? Як патлумачылі ў МАРГ, розніца ў коштах абумоўлена тым, што да адной і той жа адпускной цаны Любанскае райпа прымяніла гандлёвую надбаўку ў памеры 20 працэнтаў, а кампанія «Камплімілк Трэйд» — у памеры 14 працэнтаў.

Паводле слоў **першага намесніка міністра МАРГ Івана ВЕЖНАЎЦА,** згодна з нашым заканадаўствам, рознічныя кошты на аналагічныя тавары, якія прадаюцца ў гандлёвых аб'ектах (у тым ліку ў аўтакрамах) Любанскага райпа і гандлёвых аб'ектах іншых гаспадарчых суб'ектаў (у тым ліку гандлёвай кампаніі «Камплімілк Трэйд») могуць адрозніваецца памерамі прымененых гандлёвых надбавак. Да 9 красавіка гэтага года дзяржаўнае рэгуляванне цэн на «хлеб, вырабы булачныя (батон) з мукі пшанічнай» (за выключэннем хлябоў з даданнем збожжавых, фруктовых дабавак, дабавак з гародніны, арэхаў, сухафруктаў, спецый, клейкавіны пшанічнай сухой (глютэн пшанічны), малочных і яечных прадуктаў, хлябоў для тостаў, хлябцоў (хрумсткіх, збожжавых, экструзійных і іншых), лаваша і іншага нацыянальнага хлеба, здобных булачных вырабаў) ажыццяўлялася ў адпаведнасці з пастановай МАРГ Рэспублікі Беларусь № 25 «Аб рэгуляванні цэн на сацыяльна значныя тавары». Згодна з ёй, максімальная гандлёвая надбаўка (з улікам аптовай надбаўкі) на дадзеную групу тавараў была ўстаноўлена ў памеры 20 працэнтаў для ўсіх суб'ектаў гаспадарання. Таму відавочна, што рознічныя цэны на батон «Нежный» як Любанскім райпо, так і кампаніяй «Камплімілк Трэйд» сфармаваны правільна, надбаўка не завышана, з пункту гледжання заканадаўства ніхто нічога не парушыў.

Тым не менш для Віктара Іванавіча, як і для іншых пакупнікоў, ёсць прыемная навіна. Месяц таму максімальная гандлёвая надбаўка на «хлеб, вырабы булачныя (батон) з мукі пшанічнай» зменшылася. Адпаведна, у сувязі з гэтым знізілася і цана батона «Нежный» у аўталаўцы Любанскага райпо.

— З 9 красавіка гэтага года ўступіла ў сілу новая пастанова Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 7 красавіка 2022 г. № 214 «Аб рэгуляванні цэн», якой чарговы раз працягнута цэнавае рэгуляванне на сацыяльна значныя тавары, — паведаміў Іван Вежнавец. — Цяпер для суб'ектаў гандлю ўсталяваны гранічны максімальны ўзровень гандлёвай надбаўкі (з улікам аптовай надбаўкі) на «хлеб, вырабы булачныя (батон) з пшанічнай мукі» ў памеры 15 працэнтаў. А гэта на пяць працэнтаў ніжэй за ўзровень гандлёвай надбаўкі, якая дзейнічала да гэтага.

У суб'ектаў гандлю няма заканадаўчага абавязку ўстанаўліваць адзіны ўзровень гандлёвай надбаўкі на тавары. Кожная крама па сваім рашэнні ў сувязі са сваім фінансавым становішчам можа прымяняць любы яе памер. Галоўнае, каб яна не перавысіла максімальна дапушчальны ўзровень, устаноўлены Саўмінам. У прыватнасці, на сёння Любанскае райпа можа зрабіць на батон «Нежный» надбаўку 15 працэнтаў і ніжэй. Перавышаць жа 15-працэнтны парог ніхто не мае права. За гэта прадугледжаны штрафныя санкцыі. Часам падчас маніторынгаў МАРГ устанаўлівае факты перавышэння цэн на вызначаныя групы тавараў і, вядома, прыцягвае парушальнікаў да адказнасці. Гэта раней, у савецкія часы (як любіць згадваць мая бабуля), хлеб паўсюль каштаваў аднолькава. Зараз жа ва ўсіх крамах цэны, хоць не нашмат, але адрозніваюцца. Бо ў дзяржавы няма мэты іх выраўняць. Наадварот, ствараюцца ўсе ўмовы для здаровай канкурэнцыі суб'ектаў гаспадарання. Максімальныя ж гандлёвыя надбаўкі створаны ў першую чаргу, каб стрымліваць бескантрольны рост цэн.

Пры гэтым намеснік міністра падкрэсліў, што МАРГ як орган дзяржаўнага кіравання (згодна з артыкулам 25 Закона Рэспублікі Беларусь ад 8 снежня 2014 г. № 128-З «Аб дзяржаўным рэгуляванні гандлю і грамадскага харчавання ў Рэспубліцы Беларусь») не мае права прымушаць суб'екты гандлю (суб'екты грамадскага харчавання, пастаўшчыкоў тавараў) заключаць у прыярытэтным парадку дагаворы, якія прадугледжваюць пастаўкі тавараў, з пэўнымі контрагентамі (калі іншае не ўстаноўлена заканадаўчымі актамі Рэспублікі Беларусь), а таксама абмяжоўваць канкурэнцыю і прычыняць шкоду іх правам, свабодам і законным інтарэсам.

— Але ўсё ж такі чаму ў вясковых крамах і аўталаўках, як правіла, прымяняюцца максімальныя гандлёвыя надбаўкі на тавары, а ў гарадскіх супермаркетах усё можна купіць танней?

— Гандлёвае абслугоўванне вёсак спалучана з дастаткова высокімі выдаткамі на дастаўку тавараў да пакупнікоў, — тлумачыць Іван Вежнавец. — Гэта, у сваю чаргу, адбіваецца на іх канчатковай цане. Гандлёвая надбаўка дае суб'ектам гандлю магчымасць пакрываць выдаткі, якія звязаны з продажам тавару (у тым ліку транспартныя) і разам з тым атрымліваць прыбытак. У гарадах тавараабарот суб'ектаў гандлю вышэйшы, чым у вясковых. Гэта дазваляе ім зніжаць свае пастаянныя выдаткі на адзінку тавару (напрыклад, выдаткі на арэнду гандлёвых памяшканняў, заробак работнікаў) і, адпаведна, устанаўліваць ніжэйшыя ўзроўні гандлёвых надбавак. Адначасова ўзровень пераменных выдаткаў на абслугоўванне пакупнікоў у горадзе таксама ніжэйшы (у прыватнасці, выдаткі на дастаўку тавараў да пакупнікоў). Але яшчэ раз хачу падкрэсліць: прымяненне максімальнай гандлёвай надбаўкі суб'ектам гаспадарання згодна з дзеючым заканадаўствам не з'яўляецца цэнавым злоўжываннем.

**Надзея ДРЫНДРОЖЫК.**

Надвор'е

## ПАЛАСА ДАЖДЖОЎ, МОЦНАГА ВЕТРУ І ПАХАЛАДАННЯ

### А ў сераду чакаюцца нават невялікія замаразкі

**Усё ў гэтым свеце цыклічна. І пасля надзвычай дажджлівага красавіка першая дэкада мая дала прасохнуць залішне мокрай глебе, бо ў сярэднім па краіне за першыя 10 дзён мая колькасць ападкаў склала ўсяго 23 % ад нормы. Другая дэкада мая пачалася з цёплага надвор'я, калі ў разгар дня паветра награвалася да плюс 19—25 градусаў. Напрыклад, у чацвер было яшчэ цяплей, калі дзённыя максімумы па краіне склалі плюс 17—23 градусы, а па поўдні і паўднёвым усходзе — і зусім летнія значэнні: плюс 24—29 градусаў.**



Паводле прагнозаў сіноптыкаў, у пятніцу франтальныя раздзелы пакінуць тэрыторыю Беларусі, таму дажджоў стане менш. У няўстойлівым паветры чакаецца лакальнае развіццё воблачнасці, месцамі па краіне пройдуць кароткачасовыя дажджы.

А вось у суботу, пры паступленні прахалоднай паветранай масы з Балтыйскага мора, кароткачасовыя дажджы чакаюцца на большай частцы тэрыторыі краіны. Удзень месцамі па паўднёвым захадзе нашага рэгіёна будзе ўзмацняцца вецер да моцнага парывістага. Тэмпература паветра ў начныя гадзіны складзе плюс 5—11 градусаў, а днём пры гэтым стане крыху халадней — плюс 12—19 градусаў, па поўдні будзе да 21 цяпла.

На наступным тыдні чакаецца яшчэ большае пахаладанне. У нядзелю і панядзелак у няўстойлівай паветранай масе кароткачасовыя дажджы пройдуць у асноўным па паўночнаўсходняй частцы краіны. Тэмпература паветра ў ноч на нядзелю складзе плюс 4—10 градусаў, удзень будзе 13—20 градусаў вышэй за нуль. У панядзелак уначы мінімальная тэмпература паветра акажацца ў межах 2—7 градусаў, днём складзе 11—18, а па паўднёвым захадзе — 19—20 градусаў цяпла.

Паводле папярэдніх прагнозаў айчынных сіноптыкаў, паніжэнне тэмпературнага фону працягнецца і ў наступныя дні тыдня. У аўторак месцамі, пераважна па паўночнаўсходняй частцы краіны, пройдуць кароткачасовыя дажджы. Тэмпература паветра ноччу апусціцца да плюс 1—7 градусаў, удзень — плюс 8—14 градусаў, па паўднёвым захадзе чакаецца 15—18 цяпла.

**Сяргей КУРКАЧ.**

## ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### Адмова ад расійскіх нафты і газу будзе каштаваць Еўрасаюзу 195 млрд еўра

**Адмова еўрапейскіх краін ад расійскіх вуглевадародаў будзе каштаваць ЕС каля 195 млрд еўра, паведамляе ТАСС са спасылкай на выданне Financial Times.**

Паводле даных газеты, такую суму краіны ЕС патрацяць на працягу наступных пяці гадоў.

